РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 СТУДЗЕНЯ 2025 г. СЕРАДА № 13 (30401)

«ГЭТА ГОНАР!» ПРЭЗІДЭНТ – АБ ДАСЯГНЕННЯХ МАШЫНАБУДАЎНІКОЎ КРАІНЫ

Аб чым Аляксандр Лукашэнка гаварыў падчас наведвання МАЗа

Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка неаднаразова казаў, што такія прадпрыемствы, як МАЗ, МТЗ, БелАЗ, Мотавелазавод, Гомсельмаш і іншыя прамысловыя гіганты, — гэта брэнд краіны. Больш за тое, на што таксама часта звяртае ўвагу кіраўнік дзяржавы, гэта ўнікальныя школы, найважнейшыя кампетэнцыі, якія беларусы захавалі яшчэ з савецкіх часоў і якія робяць вялікі ўнёсак у эканоміку. Таму яны пастаянна знаходзяцца ў цэнтры ўвагі. І дзяржава не шкадуе сродкаў на іх мадэрнізацыю і ўдасканаленне, з галоўным патрабаваннем — даць вынік.

СТАР. 2–4

НОВЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ – НОВАЯ ПРАДУКЦЫЯ 10

СЕПСІС ТРЭБА ПЕРАМАГАЦЬ 15



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

26 студзеня 2025 ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У АДКАЗЕ ЗА БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ

Пачалося датэрміновае галасаванне на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Карэспандэнты «Звязды» пабывалі на некалькіх выбарчых участках і высветлілі, наколькі грамадзяне актыўныя ў першы дзень датэрміновага галасавання. Дарэчы, участкі для галасавання адкрыты з 12.00 да 19.00 без перапынку на абед. У асноўны дзень выбараў — 26 студзеня — можна будзе прагаласаваць з 8.00 да 20.00.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

СТАР. 6–7

«ГЭТА ГОНАР!» ПРЭЗІДЭНТ – АБ ДАСЯГНЕННЯХ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

На мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка наведваў Мотавелазавод, які са стварэннем на яго тэрыторыі Мінскага гарадскога тэхнапарка набыў новае дыханне. А ў аўторак Прэзідэнт прыехаў на Мінскі аўтамабільны завод, у гісторыі якога сёлета таксама пачалася новая старонка. На МАЗе створана новая аўтобусная вытворчасць. Але толькі гэтай тэмай візіт Прэзідэнта не абмежаваўся.

Фота БелТА.

«ГЭТА РЭКЛАМА НЕ ТОЛЬКІ АЎТАЗАВОДУ, АЛЕ І ЎСЁЙ КРАІНЕ»

Найперш кіраўнік дзяржавы сустрэўся з тымі, хто робіць брэнд МАЗ знакамітым на ўвесь свет – з камандай «МАЗ-СПОРТаўта». З моманту свайго стварэння ў 2010 годзе каманда ўдзельнічала ў 54 міжнародных і рэспубліканскіх гонках, у 34 з іх станавілася прызёрам ці пераможцам. У 2023 годзе «МАЗ-СПОРТаўта» выйграла ўсе гонкі, у якіх удзельнічала. Як адзначыў кіраўнік каманды Сяргей Вязовіч, гэта быў пік іх формы. У 2024 годзе каманда крыху здала свае пазіцыі – у асноўным займала другія ці трэція месцы. «Калі будзеце перамагаць? Чым больш увагі, тым меншы вынік», – заўважыў Прэзідэнт. Сяргей Вязовіч адказаў, што ў спорце заставацца на піку пастаянна вельмі складана. «Мы моцна перааснасцілі нашу тэхнічную базу. Гэта таксама немалаважна», – заўважыў ён. Сяргей Вязовіч адзначыў, што распрацоўваюцца новыя стратэгіі падрыхтоўкі, бо пад старыя сапернікі ўжо падстроіліся.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў свой час на яго даручэнні звярнулі ўвагу на каманду і на тое, што было неабходна для яе развіцця. Адпаведнае даручэнне было дадзена міністру прамысловасці. «Я яму сказаў: «Будзеш капітанам гэтай каманды. Што хочаш рабі, але дапамагай хлопцам!» – прыгадаў Прэзідэнт. Цяпер Мінпрам узначальвае Аляксандр Яфімаў, якому кіраўнік дзяржавы даручыў курыраваць гэта пытанне. «Малады хлопец, беларус сапраўдны. Вось табе новы капітан. Павінен дапамагаць. Нам трэба ўдзяліць неабходную ўвагу. Калі нешта трэба, скажы», – сказаў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да Сяргея Вязовіча.

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, з чым звязана такая ўвага да спартыўнай каманды: «Калі на міжнародных экранах ва ўсім свеце МАЗ – усе пачынаюць думаць: а што гэта за завод, які «забівае» ўсіх на трасе? Гэта – наш МАЗ, наш гонар. Гэта рэклама. І рэклама не толькі аўтазаводу, але і ўсёй краіне, і ўсёй аўтамабілебудаўнічай галіне Беларусі. Вось у чым мой інтарэс». Прэзідэнт таксама звярнуў увагу, што каманда павінна падрыхтаваць сабе годную замену. Аляксандр Яфімаў падкрэсліў, што такая задача стаіць і ў найбліжэйшыя тры гады будуць падрыхтаваны два-тры экіпажы, якія будуць дыхаць у спіну «МАЗ-СПОРТаўта».

«ПЕРАМАГАЙЦЕ — ПАДТРЫМКА БУДЗЕ!»

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што змена пакаленняў часта становіцца вялікай праблемай для многіх відаў спорту.

«Таму трэба рыхтаваць змену, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. — Я цяпер увесь час кажу пра змену пакаленняў. Наступная наша з вамі пяцігодка — каб нашых дзяцей падняць, каб яны краіну ўзялі і панеслі далей. Вось наша з вамі задача».

Па словах кіраўніка дзяржавы, важна, каб сыходзячае пакаленне не сапсавала жыццё будучаму.

Прэзідэнту паказалі імправізаваны бівак – месца размяшчэння каманды ў пустыні падчас гонак. МАЗ вырабляе аўтадамы, у якіх жывуць экіпажы. У такіх машынах створаны ўсе ўмовы, каб экіпажу і камандзе было зручна: каюты, душ, кухня, гарачая вада. Не курорт, але ў пустыні камфортна. Аляксандр Лукашэнка агледзеў размяшчэнне каманды і азнаёміўся з тэхнікай. Сяргей Вязовіч і члены каманды падрабязна расказалі пра нюансы камплектацыі і абслугоўвання гоначных аўтамабіляў – усё прадумана да дробязяў. У камандзе працуе шэсць канструктараў, якія прыслухоўваюцца да досведу членаў экіпажа і ўлічваюць іх пры праектаванні новых мадэляў. Важны момант – у гоначных грузавіках выкарыстоўваецца шмат дэталяў і вузлоў, якія ёсць і на штатных серыйных аўтамабілях. Умовы, праз якія праходзяць аўтамабілі, перагрузкі, якія яны вытрымліваюць, паказваюць усе перавагі і недахопы дэталяў і вузлоў, што вельмі важна для вытворчасці. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што члены экіпажа, якія правяралі машыны ў самых розных умовах, павінны актыўна супрацоўнічаць з канструктарамі завода, падказваць ім, даваць парады. Генеральны дырэктар МАЗа Валерый Іванковіч адзначыў, што такое ўзаемадзеянне наладжана, члены каманды «МАЗ-СПОРТаўта» задзейнічаны ва ўсіх вытворчых працэсах, удзельнічаюць у розных сацыяльных і масавых мерапрыемствах.

Аляксандр Лукашэнка настолькі зацікавіўся, што захацеў асабіста правесці тэст-драйв спартыўнага МАЗа: «Я гляджу на ваш аўтамабіль. Цікава было б праехаць дзенебудзь у кар'еры». – «Як толькі будзем гатовы, дадзім знаць», – адказаў Сяргей Вязовіч.

Фота БелТА.

Прэзідэнт паабяцаў, што камандзе «МАЗ-СПОРТаўта» будзе аказана ўсялякая падтрымка, будуць створаны ўсе ўмовы. Пры адной абавязковай – калі будзе вынік і перамогі. У час наведвання размяшчэння каманды «МАЗ-СПОРТаўта» Прэзідэнту таксама падарылі камандную форму і папрасілі пакінуць аўтограф на фотаздымках, адзін з якіх застанецца на памяць камандзе, а другі стане экспанатам у музеі Палаца Незалежнасці.

«НЯДРЭННА Ж ПАБУДАВАЛІ. УМЕЮЦЬ»

У 2023 годзе МАЗ пачаў рэалізацыю інавацыйнага праекта па рэканструкцыі аўтобуснага завода з будаўніцтвам новага вытворчага корпуса і павелічэннем вытворчых магутнасцяў да трох тысяч адзінак тэхнікі за год. Праектам прадугледжана стварэнне трох аўтаномных ліній па вытворчасці пасажырскай тэхнікі, будаўніцтва боксаў для дыягностыкі, наладкі і здачы аўтобусаў, арганізацыя спецыялізаванага зварачна-нарыхтоўча-механічнага цэха, стварэнне складской гаспадаркі. Увесці ў эксплуатацыю аўтобусны завод плануецца да красавіка 2025 года. Чакаецца, што гэта дасць магчымасць удвая павялічыць магутнасці МАЗа па вытворчасці пасажырскай тэхнікі, забяспечыць развіццё яе новага сямейства, нарасціць экспартны патэнцыял да 1,5 тысячы адзінак у год і стварыць 331 новае высокатэхналагічнае і высокапрадукцыйнае працоўнае месца.

З новай вытворчасцю Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся асабіста. «Гэту пляцоўку мы пабудавалі з нуля за паўтара года. Усё абсталяванне ўстаноўлена, працуе, персанал набраны. Тут павінны працаваць 1223 чалавекі. Сёння 431 чалавека пераводзім з дзеючай вытворчасці, далей мы склалі графік: да канца года (1 студзеня 2026 года мы павінны будзем выйсці на стапрацэнтную загрузку дадзенага вытворчага комплексу) штат будзе ўкамплектаваны», – далажыў генеральны дырэктар МАЗа Валерый Іванковіч.

«Нядрэнна ж пабудавалі. Умеюць», – ацаніў вытворчую пляцоўку Прэзідэнт. Як расказаў Валерый Іванковіч, на гэтай пляцоўцы знаходзіцца ўвесь тэхналагічны працэс – ад першага элемента да гатовага аўтобуса. Да гэтага ў адным месцы рэзалі, у другім – зварвалі, у трэцім – збіралі. Пры нейкім форс-мажоры, збоі з камплектуючымі вырабы выцягвалі на вуліцу, незалежна ад умоў надвор'я, і зацягвалі назад. Не заўсёды гэта было зручна. «А цяпер мы будзем працаваць так, як усе сусветныя кампаніі. Гэта пляцоўка сусветнага ўзроўню. У нас тры падрыхтоўчыя лініі, і па іх мы можам весці адразу тры тыпы аўтобусаў. Тое, што ў нас тэхналагічна не атрымлівалася ў

Фота БелТА.

МАШЫНАБУДАЎНІКОЎ КРАІНЫ

Аб чым Прэзідэнт гаварыў з работнікамі МАЗа

сённяшніх умовах», — адзначыў дырэктар МАЗа.

«Ва ўсім свеце так ці робаты працуюць?» — спытаў кіраўнік дзяржавы. Валерый Іванковіч растлумачыў, што робаты працуюць, калі ёсць дзве асноўныя ўмовы — аднатыпнасць і аб'ём. «Мы гэта пытанне прадумвалі. Калі мы выйдзем у вузкую прафілізацыю, то ўсталюем робатаў. Магчымасці дазваляюць», — дадаў ён.

ІДЭІ ДЛЯ ІНВЕСТПРАГРАМЫ

Асобную ўвагу Прэзідэнт звярнуў на вытворчасць нарыхтоўчых матэрыялаў. Напрыклад, профільныя трубы на прадпрыемствы пастаўляе Маладзечанскі трубапракатны завод, дзе хутка будуць асвойваць і новыя віды прадукцыі. Па меркаванні кіраўніка дзяржавы, гэты праект мог бы ўвайсці ў дзяржаўную інвестыцыйную праграму.

«Падобная прадукцыя з металу нам патрэбна будзе, гэта дэфіцыт нейкі ўжо. Таму вось яшчэ адзін праект. І не трэба выдумляць для дзяржінвест-праграмы нейкія праекты — вось ён. Ім трэба паглыбляцца. І, як толькі мы прыйдзем да таго, што нам трэба будзе жалезная руда, вось тады мы будзем за межамі краіны шукаць радовішчы, укладваць грошы і сумесна адліваць зыходныя нарыхтоўкі.

Я не хачу называць краіны, такія ўжо ёсць. Але мы да гэтага яшчэ не прыйшлі. Вось як мы ўпромся ў гэта, я вам падкажу, дзе мы будзем нешта ствараць. Вось так трэба паглыбляцца, а не прыдумваць нейкія завоблачныя тэхналогіі і вырабы», — адзначыў ён.

Яшчэ адна тэма, якую закрануў Прэзідэнт, — вытворчасць электратранспарту. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі ўжо ёсць электратранспарт: ад легкавога да пасажырскага і грузавога. Зарадныя станцыі таксама ёсць. Але, арыентуе Аляксандр Лукашэнка, трэба пашырацца і паглыбляцца. Усе тралейбусы ў нас аснашчаны магілёўскімі электрарухавікамі. Мы ўжо тры гады з імі працуем», — адзначыў Валерый Іванковіч.

«Вось яшчэ для інвестпраграмы адна тэма — вытворчасць электрарухавікоў. Ужо ёсць школа, ужо ёсць людзі, якія гэта разумеюць. Трэба ў гэтым плане паглыбляцца, і гэта сёння трэба, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Будзе попыт, будзе патрабаванне — зробім добры рухавік і ячэйкі для акумулятарнай батарэі зробім, не будзем купляць і збіраць у сябе».

«КАЛІ ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ ДАДАСЦЕ, ТАДЫ НЕ БУДЗЕ ПРАБЛЕМ»

Пасля агляду цэхаў Прэзідэнт сустрэўся з людзьмі, для якіх яны і ствараліся. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся завадчанам, што згадаў сваё папярэдняе наведванне прадпрыемства. «Вы тады працавалі хоць і ў цяпле, але ў нейкіх жудасных умовах», — сказаў ён. Прэзідэнт нагадаў аб сваім абяцанні пабудаваць новы завод, калі будзе попыт на прадукцыю. Мазаўцы не падвялі — сталі ствараць і актыўна прадаваць аўтобусы не толькі на знешніх, але і на ўнутраных рынках. «Я падумаў, што вы малайцы і вы заслужылі свой завод на вытворчасці аўтобусаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. У 2025 годзе плануецца вырабіць і прадаць 2300 аўтобусаў, грузавікоў каля 15 тысяч. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта нядрэнна, і параіў дабаўляць у вытворчасці аўтобусаў. «Калі дзве тысячы дадасце, тады не будзе праблем ні ў нас, ні ў вас, ні ў вашых дзяцей. У вашых дзяцей не будзе праблем з работай, гэта дакладна», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што будзе вельмі рады, калі яго прэзідэнцкі выццёвы праект — захаванне прамысловых гігантаў — будзе рэалізаваны. Ён расказаў, што на пачатку сваёй прэзідэнцкай кар'еры паабяцаў сабе захаваць усё тое, што было напрацавана папярэднімі пакаленнямі. МАЗ, БелАЗ, «Магілёўліфтмаш» і шэраг іншых прадпрыемстваў, на прадукцыю якіх сёння ёсць попыт, былі захаваны дзякуючы таму абяцанню.

«Калі я бачу аўтамабіль МАЗ, аўтобус, тралейбус — гэта гонар. І я шчаслівы, што мы захавалі нашу краіну як машынабудаўнічую, — прызнаўся Прэзідэнт. І адзначыў, што сёння ў нас толькі адно пытанне — як рухацца далей?

«МЫ ПАВІННЫ ЎДАСКАНАЛЬВАЦЬ ТОЕ, ШТО ЎМЕЕМ, І ЎКЛАДВАЦЬ ГРОШЫ Ў ГЭТА»

Аляксандр Лукашэнка ўспомніў нядаўнюю нараду аб дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме, на якой абмяркоўвалася пытанне, куды ўкладваць грошы. Кіраўнік дзяржавы зноў заявіў, што не трэба нічога прыдумляць. Трэба рабіць тое, што мы ўжо ўмеем рабіць на пэўным узроўні. Бо калі база ўжо ёсць, то лягчэй паднімацца да вышынь. «Мы павінны паглыбляцца. Мы павінны ўдасканальваць тое, што ўмеем, і ўкладваць грошы ў гэта», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што ў Беларусі ёсць добрыя спецыялісты, зборшчыкі, канструктары і іншыя, якія могуць сабраць усё аж да касмічнага апарата і атамнай бомбы. Пытанне ў часе, у грошах, ці сапраўды гэта патрэбна краіне і яе народу?

Прэзідэнт звярнуў увагу, што попыт на знешніх рынках непасрэдна залежыць ад якасці і забываць аб гэтым нельга, таму што якасць робіць прадукцыю канкурэнтаздольнай. МАЗа гэта таксама датычыцца. Прэзідэнт заўважыў, што такую прадукцыю робяць у дзясятках краін, таму трэба пастаянна канкурыраваць. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што больш увагі трэба ўдзяляць электрычнаму транспарту. Напрацоўкі ў гэтым плане ўжо ёсць. Дзякуючы рабоце атамнай электрастанцыі хапае і электраэнергіі.

«У нас сёння нават невялікі лішак электраэнергіі. Але ў будучыні гэтага можа не хапіць. Таму мы ў найбліжэйшы час абмяркуем з Прэзідэнтам Расіі пытанне будаўніцтва другой атамнай станцыі на тэрыторыі Беларусі.

Ці пашыраць будзем тую ў Астраўцы, ці ў нас ёсць іншая міжнародна прызнаная пляцоўка на поўдзень ад Магілёва, дзе можна пабудаваць гэтую станцыю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што ў Беларусі будуюцца жылыя дамы з электрычным абагрэвам, жыхары такіх дамоў вельмі задаволены. «Калі мы пабудуем другую станцыю, мы поўнасцю забяспечым людзей і па транспарце, і па жыллі. Таму на гэта будзем арыентавацца», — заявіў беларускі лідар.

Фота БелТА.

«КОЖНЫ З НАС ПАВІНЕН РАБІЦЬ СВАЮ СПРАВУ»

Прэзідэнт падзяліўся сваімі ўражаннямі ад знаёмства з прыватнымі прадпрыемствамі — рэзідэнтамі Мінскага гарадскога тэхнапарка, які наведваў на мінулым тыдні. Ён заявіў, што дзяржава будзе дапамагаць іх выражаваць, калі на прадукцыю будзе попыт. Акрамя таго, у рамках даручэння «Адзін раён — адзін праект» актыўна ствараюцца новыя прадпрыемствы, ствараюцца новыя працоўныя месцы. «Трэба ўдасканальвацца», — арыентуе ўсіх кіраўнік дзяржавы. «Такім чынам, выходзячы з досведу нашай з вамі працы, мы, стоячы на плячах нашых гігантаў, працягваем выбудоўваць нашу эканоміку. Ніякай ломкі не павінна быць. Усё з нечага вырастае», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Зрэшты, падкрэсліў ён, часам і трэба зламаць нешта старое, каб на яго месцы пабудаваць нешта новае. Добры прыклад — старыя фермы, на месцы якіх з'яўляюцца сучасныя малочнатаварныя комплексы. «Будзем паціху рухацца. Але што для гэтага трэба, банальна паўтару ў чарговы раз: кожны з нас павінен рабіць сваю справу. Вы на сваім працоўным месцы робіце тое, што належыць, я — на сваім. Калі мы будзем рабіць, і не проста рабіць, а спраўляцца з гэтай работай, мы будзем жыць нармальна, без вайны», — заявіў Прэзідэнт.

Усім, хто любіць вінаваціць іншых у няўдачах, ён параіў стаць перад люстэркам і спытаць сябе: што ты зрабіў? «На сябе паглядзі — мая вам парада. Непапулярна ў прэзідэнцкую кампанію, але, тым не менш, без папулізму. Заўсёды трэба паглядзець на сябе. Гэта таксама мой прынцып», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«ЗАБАРОНЫ ЗАЎСЁДЫ НЕ НА КАРЫСЦЬ. ТРЭБА ПЕРАМАГЧЫ»

Адзін з супрацоўнікаў завода падзяліўся заклапочанасцю наконт таго, што сёння моладзь стараецца стаць блогерамі, айцішнікамі і зусім не цікавіцца рабочымі спецыяльнасцямі, што ў будучыні можа прывесці да дэфіцыту кадраў.

Прэзідэнт прызнаўся, што насцярожанасць такая ёсць. Але ў той жа час, паводле яго слоў, у Беларусі гэтая праблема стаіць не так востра, як у іншых краінах. Ён адзначыў, што сёння краіне найперш патрэбны людзі, якія ствараюць рэальны прадукт, задзейнічаны ў рэальным сектары эканомікі. І тут праблема куды больш сур'ёзная, чым блогеры. Напрыклад, па словах Прэзідэнта, трэба разабрацца з тымі, хто не працуе. А такіх людзей нямала, нават у сталіцы. Трэба вырашыць пытанне працаўладкавання мігрантаў. Але, паставіў задачу беларускі лідар, кіраўнікі на прадпрыемствах павінны вельмі ўважліва ставіцца да такіх кадраў, разглядаючы кожнага. І браць на працу толькі тых, хто сапраўды зможа і будзе працаваць, а не ствараць праблемы. Такім людзям у Беларусі рады.

Што датычыцца блогераў, то Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта невялікая праблема. Цяпер яны актыўна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах «Марафону адзінства», адкрываюць для сябе і сваіх падпісчыкаў Беларусь. Таму, па словах Прэзідэнта, не варта прымаць нейкія жорсткія меры ў гэтым плане. Забароны заўсёды не на карысць.

«Трэба перамагчы. Трэба даказаць, што мы найлепшыя. Калі пра нас дрэнна пішуць, нам трэба паказваць сваё, добрае, як мы робім на «Марафоне адзінства». Гэта цяжэй, але важней. Гэта будзе ў сэрцы і ў мазгах кожнага чалавека», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым, заявіў ён, калі нешта трэба будзе забараніць дзеля бяспекі, захавання краіны, гэта будзе зроблена. Але цяпер у гэтым няма неабходнасці.

«Многія, я чытаю, папісваюць, асабліва нашы гэтыя ачмурэлыя за мяжой: «Вось, ён тут перад выбарамі, у выбары хоча закрыць інтэрнэт». Я пачынаю абтэлефаноўваць адказных, членаў урада: «Хлопцы, вы, можа, дзесьці штосьці языком ляпнулі?» — «Не. Мы не маем права». Я гавару: «Глядзіце, без майго ведама гэтага не рабіце», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, улада ніколі не думала аб закрыцці інтэрнэту. Тым больш, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, там ёсць і шмат чаго карыснага.

«МЫ БОЛЬШ ЖАРТАВАЦЬ СА СВАЁЙ ДЗЯРЖАВАЙ, А Я — З ВАМІ — НЕ МАЕМ НАМЕРУ»

Тэма выкарыстання інтэрнэту працягнулася і ў наступным пытанні. У Прэзідэнта спыталі, ці можна неяк разабрацца з крыснёй і дэзынфармацыяй у інтэрнэце і спыніць гэта. «Можам спыніць усё што заўгодна. Мы больш жартаваць са сваёй дзяржавай, а я — з вамі — не маем намеру. Таму што гэта можа прывесці да цяжкіх узрушэнняў. Ну, хто ў нас у Беларусі ў гэтым не пераканаўся

«ГЭТА ГОНАР!» ПРЭЗІДЭНТ — АБ ДАСЯГНЕННЯХ МАШЫНАБУДАЎНІКОЎ КРАІНЫ

пасля 2020 года? Я казаў тады: не спяшайцеся, пройдзе час — ён расставіць усё на свае месцы», — адказаў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што былі моманты, калі прыходзілася нешта спыняць і на гадзіну-другую адключаць «ашалелых блогераў». Але, па словах кіраўніка дзяржавы, тады была такая неабходнасць. «Гэта былі мае функцыі, я прымаў гэтыя рашэнні. Часам разумеючы, што вы гэтага не зразумееце. Думаю, міне час, — вы ў гэтым пераканаецеся, — адзначыў ён. — Прышчэпку атрымалі. Ну, а што цяпер? Цяпер вы дакладна разумееце: вось гэта (тая ці іншая інфармацыя ў інтэрнэце) — хлусня, у нас гэтага няма».

Як заўважыў Прэзідэнт, палова з тых, хто з'ехаў, сёння хоча вярнуцца назад. «Калі ласка. Гэта ваша зямля. Можа, вы адурэлі, ачумелі ў свой час, занялі такую ??пазіцыю. Чалавеку трэба заўсёды даваць шанц. Калі ласка — вяртайцеся. Але да Шведа — генеральнага пракурора. Створана камісія з прадстаўнікоў рабочых, сялян, СМІ, якія бачылі, што тварылі ў 2020 годзе», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на тым, што кожны павінен адказваць па законе, асабліва калі «ламаў, крышыў, напарадзе бег і за сабой клікаў, з сякерай кідаўся».

«Трэба ўмець дараваць. Але тым, каму можна дараваць. І прытым не я павінен дараваць, хаця я па Канстытуцыі маю права памілаваць любога чалавека. Але я за гэта не ўзяўся. Таму што яны вам стваралі нязручнасці, яны ваша ламалі, яны вас спрабавалі зганьбіць. Ну, дык вы прыміце рашэнне, і мне даложыце. Будзе станоўчае рашэнне — я падпішу ўказ. Не — значыць не. Таму мы акуратна ставімся да гэтых людзей», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што не ўсё ідэальна, хапае і праблем. Ён заклікаў глядзець на рэчы рэальна, а не верыць укідам у інтэрнэце, тым больш ад тых, хто з'ехаў за мяжу. «Тыя, хто чытае гэтыя опусы збеглых і радуецца, — гэта значыць, чалавек не перавыхаваўся. Ён якім быў да 2020 года, такім і застаўся. Але гэтыя людзі ёсць у любым грамадстве», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што з гэтым трэба не змагацца, а перамагаць. «І калі мы змагаемся не іх жа, дапусцім, метадамі, а на іх полі і перамагаем — гэта самае каштоўнае. А закрыць рот можам. Але толькі заўсёды трэба задаваць пытанне: ці трэба сёння і навошта гэта? Пакуль не трэба», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

«ДЛЯ МЯНЕ БУДЗЕ НАЙВАЖНЕЙШЫМ НАПРАМКАМ РАБОТЫ СВАБОДА ЧАЛАВЕКА»

«Я вам павінен сказаць: калі мне яшчэ давядзецца працаваць Прэзідэнтам, адным з асноўных маіх напрамкаў будзе тое, каб людзям не закрывалі рот. Каб не было

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

Фота БелТА.

гэтай лішняй зааранізаванасці, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Для мяне будзе найважнейшым напрамкам работы свабода чалавека. Але свабода, як мяне калісьці вучылі: вось ты — асоба, ты свабодны. Але побач плячо аднаго, тут плячо другога. Не штурхай яго. Вось гэта твая свабода, а гэта — яго. І ты яму не перашкаджай». Прэзідэнт адзначыў, што чалавек вольны жыць у сваёй краіне свабодна. Але не перашкаджаючы іншым. «Вось маё патрабаванне. І вы нікому не верце, калі нехта вам прыйшоў, тут рот закрывае, сказаць не дае. Калі ласка. Але адна справа, калі ты сам-насам размаўляеш, іншая справа, калі ты ў калектыве — пяць чалавек — размаўляеш. Трэцяя справа, калі ў цябе калектыў у некалькі тысяч. І чацвёртая справа, калі ты ў тэлевізары ці як блогер вяшчаеш. Ты павінен несці адказнасць, ты сваю інфармацыю выдаеш на мільёны людзей», — заявіў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што адказвае за свае словы, і так павінен кожны.

«Гэта называецца ў народзе «жыві свабодна, але не перашкаджай жыць іншаму». Гэта будзе адзін з напрамкаў. Гэта суразмерна таму, што я заўсёды гавару аб тым, што мы павінны сваё жыццё будаваць без вайны. Гэта — самы прыярытэт», — дадаў Прэзідэнт.

Па яго словах, наша краіна павінна быць бяспечнай, таму пытанні бяспекі, абароны — гэта першаступенныя пытанні. Каму патрэбна краіна, дзе бацькі баяцца дзіця выпусціць на вуліцу? — такое рытарычнае пытанне задаў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што такі перыяд быў у 1990-я гады і прыйшлося прыкласці максімум намаганняў, каб гэта скончыць. Цяпер не тая сітуацыя. Сёння, па словах Аляксандра Лукашэнкі, асноўныя пагрозы на граніцы. І ён папрасіў грамадзян дапамагаць у вырашэнні гэтых праблем: «Калі вы ўбачылі нешта неардынарнае, нешта не тое, праінфармуйце нас, мы праверым».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што паблізу нашых граніц прысутнічаюць узброеныя банды, якія не адмовіліся ад ідэі захапіць кавалак беларускай зямлі і ставіць на ім умовы. «Гэтага нельга дапусціць. Таму, калі нешта не так, падкажыце нам. Міліцыі, яшчэ камусьці набярыце, падкажыце. У нас рухомая дзяржава. Вы таксама павінны берагчы мір і беспеку. У гэтых адносінах мы будзем старацца працаваць, але з вашай дапамогай», — адзначыў беларускі лідар.

«ЗАЎСЁДЫ ТРЭБА БЫЦЬ ШЧЫРЫМ У ЗНОСІНАХ З ЛЮДЗЬМІ І ГАВАРЫЦЬ ПРАЎДУ»

Безумоўна, пагаварылі і пра выбарчую кампанію. Аляксандр Лукашэнка не раз адзначаў, што ўважліва за ёй не сочыць з-за недахопу часу. Але некаторымі назіраннямі падзяліўся. «Забяспечыць спакой цяпер — мая галоўная задача, — сказаў ён. — Думаю, не, трэба ўсё ж паслухаць альтэрнатыўных кандыдатаў. І неяк выпадкова я ўключаю тэлевізар, — кандыдаты. Я вытрымаў паўтара чалавека, шчыра скажу. Мне спадабаўся Сярожа Сыранкоў. Ну нармальна. Ён гаворыць: вы ведаеце, мы не супраць, мы за, мы разам, і мы будзем жадаць перамогі дзеючаму Прэзідэнту. Таму што тое, што ён робіць, не разыходзіцца з нашай праграмай. Сумленна і шчыра».

Адзін з кандыдатаў агучыў пытанне нібыта з народа аб аплаце настаўнікам за праверку сшыткаў. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што яму пра гэта не трэба расказваць і ўвогуле гэта глупства. «Сшытак — гэта зваротная сувязь настаўніка з вучнем. Ці вучня з настаўнікам. Ты даў яму заданне, ён робіць, — ты павінен праверыць, як ты яму даў гэтыя веды, ці здолеў ён. Ці дыктант, ці сачыненне напісаў — што гэта за чалавек, ён засвоіў веды ці не? Калі ў цябе ёсць нейкі іншы метад — калі ласка, карыстайся», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не трэба прымушаць настаўніка рабіць тое, што ён не лічыць патрэбным. Галоўнае — каб дзеці засвоілі веды. Менавіта па гэтым крытэрыі ацэньваюць настаўнікаў.

«Заўсёды трэба быць шчырым у зносінах з людзьмі і гаварыць праўду — тое, што думаеш. І не хлусіць. А сёння не гаварыць трэба — сёння трэба рабіць. Сёння нам трэба будаваць прадпрыемствы і забяспечваць людзей не проста працай — добрай працай, каб яны менш крыўдзіліся, што ў іх слабая заработная плата. У тых, хто працуе і хто варты большага», — сказаў Прэзідэнт.

«КАЛІ ТЫ МІРАТВОРАЦ, ПРАЦУЙ НА ТОЕ, КАБ ВОЙНАЎ НЕ БЫЛО. ГЭТА ТЫ МОЖАШ»

Не абмінулі ўвагай і яшчэ адну электаральную кампанію. Праўда, у ЗША. Як вядома, у панядзелак прайшла інаўгурацыя Дональда Трампа. У Аляксандра Лукашэнкі спыталі меркавання наконт планаў Трампа падпісаць сотню ўказаў за адзін дзень. Па словах беларускага лідара, у нашай краіне ўсё ідзе ад жыцця. А Трампу давядзецца падпісваць указы, якія адмяняюць указы яго папярэдніка Джо Байдэна.

«Калі сёння адзін прэзідэнт прымае ўказы, а другі адмяняе, гэта характарызуе краіну. Не толькі яго самога, але краіну. Значыць, у вас сур'ёзная нестабільнасць. У вас няма галоўнага — пераемнасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заўважыў, што ў свеце палітыкаў ацэньваюць з пункту гледжання пераемнасці. Цяпер гэта асабліва актуальна і для Беларусі, як неаднаразова падкрэсліваў Прэзідэнт, цяпер у нашай краіне праходзіць змена пакаленняў. «Жыццё ідзе, яго спыняць нельга. І нават калі будзе іншы Прэзідэнт, ён не павінен у мяне камяні кідаць. Мы павінны пасля сябе прывесці нармальных моцных людзей, каб гэта палітыка, якая вамі падтрымліваецца, працягвалася», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка згадаў яшчэ адно абяцанне Дональда Трампа — разабрацца з канфліктам ва Украіне. Па яго словах, гэта звязана яшчэ і з любоўю амерыканскага лідара да эпатажу. «Калі ты міратворац, працуй на тое, каб войнаў не было. Гэта ты можаш. Таму што амерыканцы заўсёды развязвалі гэтыя войны. Ці падштурхоўвалі да войнаў. Калі ты гэта зробіш — ну, хочаш быць нобелеўскім лаўрэатам — мы таксама цябе падтрымаем, прадставім. Хоць там ужо Нобелеўская прэмія нічога не значыць», — заявіў беларускі лідар. Ён нагадаў і пра абяцанне Трампа ашчаслівіць амерыканскі народ. Але, па словах Аляксандра Лукашэнкі, ашчаслівіць толькі адзін народ немагчыма, трэба нармальна ўзаемадзейнічаць і з іншымі краінамі.

Ён расказаў, што глядзеў выступленне Трампа ў прамым эфіры і вельмі негатыўна ўспрыняў тое, як у сваёй прамове Дональд Трамп крытыкаваў свайго папярэдніка Джо Байдэна. «Так нельга. Нельга крыўдзіць, абражаць тых, хто быў да цябе. Ну, былі. Дрэнна рабілі — выпраўляй гэтыя памылкі, народ убачыць — скажа «дзякуй». У гэтым сутнасць нашай прэзідэнцкай работы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

* * *

На памяць аб наведванні прадпрыемства Прэзідэнту падарылі аўтобус МАЗ умяшчальнасцю 60 чалавек. Ён будзе перададзены сацыяльна-педагагічнаму цэнтру Заводскага раёна Мінска.

Аднак з пустымі рукамі з прадпрыемства Прэзідэнт не з'ехаў. Навучэнцы сталічнага каледжа аўтамабілебудавання выказалі яго даручэнне наконт распрацоўкі айчынных сякер, арганізавалі на тэрыторыі каледжа майстэрні і калун, выраблены там, падарылі кіраўніку дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў за такі нечаканы падарунак і паабяцаў праверыць яго ў справе яшчэ да выбараў, а таксама пры неабходнасці забяспечыць дровамі «з-пад гэтай сякеры».

Валерыя СЦЯЦКО.

МЕРКАВАННЕ

У АБВЯШЧЭННІ ПЯЦІГОДКІ ЯКАСЦІ ЗАКЛАДЗЕНЫ ПРЫНЦЫП СТРАТЭГІЧНАГА ПРАДБАЧАННЯ

Сяргей ХАМЕНКА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі:

— Паняцце якасці датычыцца літаральна ўсіх сфер жыцця і дзейнасці нашай дзяржавы. Сама назва «Рэспубліка Беларусь» на сённяшні дзень ужо з'яўляецца брэндам — гэта сімвал справядлівасці, мірнага суіснавання і высокай якасці жыцця людзей. Таму мы разумеем, што абвешчаная ўказам кіраўніка дзяржавы пяцігодка якасці датычыцца не толькі прамысловасці і эканомікі. Гэта датычыцца і сферы жыццёвых, сацыяльных адносін унутры нашага грамадства — гэта і гістарычная памяць, і захаванне тых пазіцый, якія закладзены нашымі продкамі. У самім паняцці якасці закладзена адпаведнасць тым патрэбам, якія на сёння ёсць у нашым грамадстве.

Вядома, якасць — не толькі вытворчасць, але пры гэтым важна памятаць і разумець, што Беларусь — экспарцёр больш чым у 200 краін (тыя ж самыя малочныя прадукты ведаюць літаральна ва ўсім свеце). Сусветны рынак прадугледжвае жорсткую канкурэнцыю, спажыўцы ў XXI стагоддзі вельмі патрабавальныя, і якасць — адзін з найважнейшых фактараў, каб яе вытрымаць. Можна сказаць, што ў абвяшчэнні пяцігодкі якасці закладзены прынцып стратэгічнага прадбачання, якое ў нашага Прэзідэнта на працягу 30 гадоў мы назіраем у самых розных сферах. Пяцігодка якасці — гэта стварэнне ўмоў, якія будуць спрыяць развіццю нашай дзяржавы ў наступныя пяць гадоў.

З'яўляючыся каардынатарам выканання Мэт устойлівага развіцця ў Беларусі, не магу не згадаць і іх у кантэксце пяцігодкі якасці. Гэта, па сутнасці, эканамічны, сацыяльны і экалагічны кірункі развіцця грамадства дзеля будучых пакаленняў. Для нашай краіны Мэты ўстойлівага развіцця — гэта рэальнасць, яны не толькі прадэкларацыя, але і рэалізуюцца на практыцы. Гэта прызнаюць нават не самыя лепшыя сябры нашай краіны.

Кожны год пяцігодкі якасці будзе тэматычным. Такі падыход да абазначэння асноўных кірункаў — гэта прыклад кіраўнічай дзейнасці дзяржаўнага маштабу нашага кіраўніка краіны. Для таго каб вызначыць гэтыя асноўныя кірункі, праводзіцца глыбокі маніторынг эканамічнай і сацыяльнай абстаноўкі, якая складваецца як вакол нашай краіны, так і ўнутры яе. І зноў жа, гаворачы аб стратэгічным прадбачанні нашага Прэзідэнта, неабходна сказаць, наколькі правільна выбіраецца, куды накіраваць асноўныя намаганні. Будаўніцтва Беларускай АЭС, дзеянні падчас пандэміі кавіду, узмацненне бяспекі дзяржавы, меры па захаванні яе суверэнітэту... Рэспубліканскія органы дзяржкіравання, грамадзянская супольнасць дакладна ведаюць, куды менавіта накіраваць намаганні і рэсурсы, каб дасягнуць вызначанай мэты, дабіцца максімальнага рэзультату.

УРАЧЫСТА І МАШТАБНА

Якім у Беларусі будзе святкаванне 80-годдзя Вялікай Перамогі, абмеркавалі ва ўрадзе

Фота БелТА.

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА ўчора, 21 студзеня, правёў пасяджэнне Рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Ён адзначыў, што летась быў праведзены комплекс мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю вызвалення Беларусі:

— Мерапрыемствы прайшлі на высокім арганізацыйным і ідэйна-палітычным узроўні, выклікалі пазітыўны грамадскі рэзананс у грамадзян нашай краіны і замежных гасцей.

Раман Галоўчанка працягнуў, што на дадзены момант аргкамітэт знаходзіцца на пэўным экватары сваёй работы:

— Мы нацэлены на правядзенне мерапрыемстваў да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне на такім жа высокім узроўні. Падрыхтоўка ўжо вядзецца.

Прэм'ер-міністр паведаміў, што многія мерапрыемствы арганізаваны, праводзяцца ў планавым парадку, і патлумачыў:

— Гэта датычыцца ўвекавечання памяці абаронцаў Айчыны, ваенна-мемарыяльнай, ваенна-пошукавай работы, рэстаўрацыі і прывядзення ў належны стан памятных месцаў. Асаблівая ўвага, вядома ж, надаецца клопату аб ветэранах і асобах, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. У арганізацыях аховы здароўя вядзецца работа па лячэбна-дыягнастычных мерапрыемствах у рамках комплексных медыцынскіх аглядаў.

Асобным блокам Раман Галоўчанка прапанаваў абмеркаваць правядзенне мерапрыемстваў 9 мая 2025 года:

— Прэзідэнтам пастаўлена задача разам з традыцыйнымі для такіх дат мерапрыемствамі (урачысты сход, канцэрт, парад) правесці яшчэ адно — на пляцоўках Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра, а менавіта своеасаблівую выстаўку, прысвечаную 80-годдзю Перамогі і дасягненням сучаснай беларускай абаронай прамысловасці, для таго каб паказаць нашу пераемнасць у гэтым пытанні.

Прэм'ер-міністр прапанаваў агучыць падыходы ў гэтым кірунку прадстаўнікоў ведамстваў і дадаў, па якой прычыне:

— Мінабароны, Мінкультуры, Дзяржкамваенпрамам прадстаўлены пэўныя прапановы па арганізацыі гэтага мерапрыемства, але ў поўным аб'ёме іх назваць канцэпцыяй нельга. Таму заслухаем асноўныя падыходы і ўдакладнім задачы.

У гутарцы з журналістамі першы намеснік міністра культуры Дзмітрый Шляхцін расказаў пра выстаўку да 80-годдзя Перамогі, якую арганізуюць у Мінскім міжнародным выставачным цэнтры.

Паводле яго слоў, яна будзе даволі вялікая:

— Цяпер мы адпрацоўваем пытанні па плошчах, таму што паралельна ў цэнтры будуць праходзіць і іншыя выставачныя мерапрыемствы. Гэтая выстаўка дазволіць нам паказаць прадметы, звязаныя з тэмай Вялікай Айчыннай вайны, якія або вельмі даўно не экспанаваліся, або не экспанаваліся зусім. Там прадставяць свае экспанаты Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны гістарычны музей, мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць — герой» і рэгіянальныя музеі. Усю гэту прадметную базу мы цяпер адпрацоўваем.

Першы намеснік міністра агучыў спадзяванні, што ўдасца даволі шырока і якасна паказаць тэму генацыду беларускага народа.

Таксама вельмі цікавай для наведвальнікаў тэмай на выстаўцы стане побыт беларускіх партызан. Спікер падкрэсліў, што асноўная задача — яшчэ раз паказаць усім, што зрабіў беларускі народ дзеля Вялікай Перамогі, і тое, як Беларусь на сучасным этапе захоўвае гістарычную праўду.

Дзмітрый Шляхцін дадаў, што цэнтральныя мерапрыемствы пройдуць у Мінску, але праграма мерапрыемстваў па лініі Міністэрства культуры даволі шырокая і захопліваe ўсю краіну.

ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ, ДЭМАГРАФІЯ, ПАЛЯПШЭННЕ ІНФРАСТРУКТУРЫ

Над чым у бліжэйшыя пяць гадоў будзе працаваць медыцына

Павышэнне нараджальнасці, умацаванне здароўя насельніцтва, лічбавая трансфармацыя, развіццё высокатэхналагічных відаў меддапамогі будуць ключавымі кірункамі для аховы здароўя ў найбліжэйшыя пяць гадоў, аб'яўленых пяцігодкай якасці.

ПАДТРЫМКА МАЦЯРЫНСТВА

Як адзначылі ў Міністэрстве аховы здароўя, Беларусь уваходзіць у дзясятку краін з самымі нізкімі паказчыкамі дзіцячай смяротнасці. У краіне забяспечана стапрацэнтнае прыняцце родаў кваліфікаванымі ўрачамі. Функцыянуе шматузроўневая сістэма аховы здароўя маці і дзіцяці. Для павышэння нараджальнасці гарантавана правядзенне адной бясплатнай спробы ЭКА і прапануецца абмеркаваць магчымасць правядзення другой.

У РНПЦ «Маці і дзіця» на працягу 15 гадоў паспяхова праводзяцца высокатэхналагічныя ўнутрычэраўныя аперацыі. Арганізаваны банк груднога малака, працуюць выязная рэанімацыйна-кансультатыўная брыгада і вучэбна-трэніровачны цэнтр. Выкарыстоўваецца клетачная тэрапія для карэкцыі псіханеўралагічных парушэнняў у неданошаных нованароджаных. Укаранёны і працуюць мадэльныя цэнтры па навучанні бацькоў асновам бяспечнай жыццядзейнасці дзяцей.

ДЫСПАНСЕРЫЗАЦЫЯ І СКРЫНІНГІ

Ключавая задача ва ўмацаванні здароўя насельніцтва — узмацненне эпідэміялагічнай бяспекі і зніжэнне ўзроўню захваральнасці. Плануецца забяспечыць усеагульны ахоп насельніцтва паслугамі першаснай медыцынскай дапамогі, у тым ліку за кошт удасканалення дыспансерызацыі і медыцынскіх скрынінгаў.

Зрэшты, неанатальны скрынінг праводзіцца ў РНПЦ «Маці і дзіця» для ўсіх нованароджаных і ўключае тэсціраванне на пяць захворванняў: фенілкетанурыю, першасны прыроджаны гіпатырэоз, мукавісцыдоз, галактаземію і прыроджаную дысфункцыю кары надныракнікаў. У цэлым па краіне ў дарослых праводзіцца скрынінг раку малочнай залозы, раку прастаты, калярэктальнага раку, раку шыйкі маткі, скрынінг цукровага дыябету II тыпу і інш.

ВЫСОКАТЭХНАЛАГІЧНАЯ ДАПАМОГА

Ужо сёння для лячэння пацыентаў з інсультам прымяняюцца высокатэхналагічныя метады: унутрывенны трамбалізіс з выкарыстаннем рэкамбінантнага тканкавага актыватара плазмінагену, механічная эндаваскулярная тромбэкстракцыя, эндартэрэктамія, ангіяпластыка і стэнціраванне сонных і вертэбральных артэрый.

Маркуецца пашырыць аб'ёмы аказання высокатэхналагічных відаў медыцынскай дапамогі ў галіне кардыяхірургіі, нейрахірургіі і транспланталогіі, траўматалогіі і артапедыі, анкалогіі і пластычнай эстэтычнай хірургіі, а таксама стаматалогіі.

Летась у краіне выкананы 492 аперацыі па трансплантацыі органаў. У галіне кардыяхірургіі агульная колькасць аперацый на сэрцы і каранарных сасудах склала 20 259. У галіне траўматалогіі і артапедыі летась выкананы 21 349 эндапратэзаванняў буйных суставаў, з іх тазасцегнавога сустава — 13 921, каленнага сустава — 7415, плечавога сустава — 13.

НОВЫЯ ПАЛІКЛІНІКІ І БАЛЬНІЦЫ

Не менш важная задача — развіццё інфраструктуры аховы здароўя. Намечана будаўніцтва амбулаторна-паліклінічных арганізацый аховы здароўя ў Полацку, Гомелі, Заслаўі, Фаніпалі, Крычаве, Мінску. З'явіцца новыя лячэбныя карпусы (профільныя аддзяленні) бальніц у Паставах, Гомелі, Гродне, Заслаўі, Мінскім раёне (Мінская абласная клінічная бальніца), Магілёве. Запланавана рэканструкцыя лячэбных карпусоў у Брэсце, Пінску, Давід-Гарадку, Віцебску, Чавусах, Гродне, Мінскім раёне (Рэспубліканская клінічная бальніца медыцынскай рэабілітацыі і РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі), Мінску.

Алена КРАВЕЦ.

Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки" извещает о проведении повторного открытого аукциона

Лот №1:

1) **капитальное строение** с инвентарным номером 150/С-23374 (наименование: Дом животноводов МТФ № 3; назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения), площадью 259,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 43/4, вблизи д. Борки, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001268 площадью 6,9133 га, составные части и принадлежности: а-Септик, б-Асфальтированная площадка, в-Бетонная площадка, г-Металлическое ограждение;

2) **капитальное строение** с инвентарным номером 150/С-23373 (наименование: телятник МТФ № 3; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 895,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 43/2, вблизи д. Борки, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001268 площадью 6,9133 га;

3) **капитальное строение** с инвентарным номером 150/С-23372 (наименование: коровник МТФ с молочным блоком; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 1776,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 43, вблизи д. Борки, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001268 площадью 6,9133 га;

4) **капитальное строение** с инвентарным номером 150/С-23370 (наименование: коровник МТФ № 3; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 1514,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 43/1, вблизи д. Борки, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001268 площадью 6,9133 га;

5) **капитальное строение** с инвентарным номером 150/С-23365 (наименование: коровник МТФ № 3; назначение: здание специализированное животноводства) площадью 1282,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, Дворецкий с/с, 43/3, вблизи д. Борки, на земельном участке с кадастровым номером 124782000001001268 площадью 6,9133 га

Начальная цена, руб. (с учетом НДС)	135 864,00	Размер задатка, руб.	13 586,40

Продавец: ОАО «Вульковский рассвет», 225666 Брестская обл., Лунинецкий р-н, аг. Вулька-2, ул. Советская, 31, тел./ф 80164796393. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки", г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** до 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** Покупателю предоставляется рассрочка оплаты приобретенного на торгах имущества на срок до 24 (двадцати четырех) месяцев. Оплата приобретенного в рассрочку на торгах имущества производится в следующем порядке: - аванс в размере 30 % (с учетом ранее внесенной суммы задатка) уплачивается в течение 20 (двадцати) календарных дней с момента заключения договора по результатам торгов; - 70 % равными долями в течение 24 (двадцати четырех) месяцев с момента передачи имущества. Ежемесячная сумма рассрочки не индексируется. Ежемесячный платеж осуществляется не позднее 25 числа каждого месяца, следующего за месяцем передачи имущества. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

Аукцион состоится 11 февраля 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8-(0162)-40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 09.00 до 17.00. Последний день приема заявлений — 10 февраля 2025 г. до 17.00

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного открытого аукциона

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» – **06 февраля 2025 года в 11-30** проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

№ п/п	Сведения о предмете аукциона	Начальная цена продажи со снижением на 40% без НДС, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
Лот 2	Экскаватор гусеничный JCB JS220SC, заводской номер JCBJS220CA61203762, год выпуска 2006, регистрационный знак ТК-6 3057, инвентарный номер 654	61200,00	6120,00

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **06 февраля 2025 года в 11.30** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утверждённое приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).

4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **31.01.2025 г., время: 17.00**.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.

8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

9. Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 12.11.2024 и на сайте ОАО «ДСТ № 3».

У АДКАЗЕ ЗА БУДУЧЫНЮ КРАІНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На выбарчым участку № 16, які размешчаны ў сталіцы на базе Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, сярод выбаршчыкаў пераважае моладзь. Многія галасуюць упершыню. Па інфармацыі Цэнтральнай выбарчай камісіі, першы раз у галасаванні прыме ўдзел больш як 88 тысяч выбаршчыкаў. Для іх Цэнтрвыбаркам традыцыйна падрыхтаваў падарунак – кнігу «Сімвалы суверэннай Беларусі» і футболку з надпісам «Мой голас ПЕРШЫ!».

Як прызнаюцца маладыя выбаршчыкі, гэтая падзея запомніцца ім на ўсё жыццё. Студэнт Арцём Гардзіевіч вырашыў прагаласаваць датэрмінова, каб у выхадныя дні паехаць дахаты. Малады чалавек прызнаецца: падчас ажыццяўлення свайго грамадзянскага абавязку адчувае найвялікшую адказнасць. «Усё залежыць ад кожнага чалавека: мой голас – пэўны ўнёсак у лёс краіны, – кажа Арцём. – Усе павінны скарыстацца сваім правам галасавання. Мы павінны ведаць, што больш за ўсё хвалюе народ».

Для другакурсніка ўніверсітэта Максіма Есіповіча гэта таксама першыя выбары. «Вельмі хвалююча рабіць такі важны выбар першы раз, – прызнаецца ён. – Мы ўсе адказныя за будучыню сваёй краіны, адпаведна, лічу, што важны голас кожнага». Па яго словах, вельмі зручна, што прадугледжана датэрміновае галасаванне. «Можна пазбегнуць вялікай чаргі і ў асноўны дзень запланаваць нешта іншае», – патлумачыў малады чалавек.

Як і ўсе выбаршчыкі, хто галасуе ўпершыню, Арцём і Максім атрымалі ад членаў выбарчага ўчастка футболку з надпісам «Мой голас ПЕРШЫ!» і падарункавае выданне «Сімвалы суверэннай Беларусі». Футболкі ўжо паспяшаліся памераць. Кнігу, вядома, пагарталі. Асабліва спадабалася выкарыстанне QR-кодаў, дзякуючы якім можна больш падрабязна азнаёміцца з сімваламі Беларусі: напрыклад, адправіцца на экскурсію па Мірскім замку.

За працэсам сочаць нацыянальныя назіральнікі. Адзначаюць, што з першых хвілін адкрыцця выбарчага ўчастка

маладыя людзі актыўна прымаюць удзел у галасаванні. «Хтосьці ў нядзелю будзе не ў Мінску, у кагосьці – праца, іншыя справы, – тлумачыць нацыянальны назіральнік. – Усё праходзіць у адпаведнасці з заканадаўствам, у спакойнай і нават святочнай абстаноўцы».

Сакратар участковай камісіі № 16 Алена Андрэеўна ўдакладніла, што з самага пачатку электаральнай кампаніі маладыя людзі звярталіся ў камісію з пытаннямі. «Адкрытыя дыялогі, якія праводзіліся на базе нашага ўніверсітэта, далі магчымасць зрабіць маладым людзям правільны выбар», – падкрэсліла яна. Плануецца, што на дадзеным участку ўпершыню ў галасаванні прыме ўдзел больш як 250 студэнтаў.

З пытаннямі ў камісію звяртаецца не толькі моладзь. Тэлефануюць прадстаўнікі розных узроставых катэгорый, задаюць пытанні, якія іх цікавяць. У прыватнасці, па пэўных прычынах (у асноўным з-за праблем са здароўем) просяць наведаць па месцы жыхарства ў асноўны дзень галасавання для таго, каб і ў іх была магчымасць выканаць свой канстытуцыйны абавязак.

Вераніка КАНЮТА.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ЗА МІРНАЕ НЕБА І КВІТНЕЮЧУЮ БЕЛАРУСЬ

Моладзь Магілёўшчыны ведае, за што яна галасуе

У першы дзень датэрміновых выбараў у фае Беларуска-Расійскага ўніверсітэта (БРУ), дзе размясціўся ўчастак для галасавання № 1 Ленінскага раёна Магілёва, ужо з раніцы панавала ўрачыстая атмасфера. У спісах тых, хто галасуе, на гэтым участку 1668 выбаршчыкаў, 13 з іх — упершыню.

За 10 хвілін да пачатку галасавання дэманструецца, што празрыстая скрыня для датэрміновага галасавання пустая, і апячатваецца членамі ўчастковай камісіі пад кантролем назіральнікаў. У 12.00 першы выбаршчык бярэ бюлетэнь. Ім стала студэнтка першага курса МДУ імя А. Куляшова Дар'я Ніжагародава. Для яе гэтая важная падзея адбылася ўпершыню.

На твары Дар'і – пачуцці лёгкага хвалявання, гонару, задавальнення. Выбар – гэта вельмі адказна. Дзяўчына прымае віншаванні і падарункі. Ёй уручаюць брашуру з сімваламі суверэннай Беларусі, значок і футболку ад БРСМ з красамоўным надпісам «Мой голас – першы!».

– Сёння адбыўся вельмі важны момант у маім жыцці, – голас дзяўчыны крыху дрыжыць, на шчоках – лёгкі румянец. – Я прагаласавала за стабільнасць, суверэннасць, за квітнеючую Беларусь.

У дзень пачатку датэрміновых выбараў падтрымаць тых, хто галасуе ўпершыню, прыехала ў Магілёў заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь у перыяд з 1996 да 2021 года Лідзія Ярмошына. На сустрэчу з ёй у БРУ прыйшлі 300 прадстаўнікоў навучэнскай моладзі.

– Самае галоўнае – данесці да маладых людзей, якія ўпершыню ідуць галасаваць, як важна не памыліцца з выбарам, – адзначыла Лідзія Мікалаеўна ў размове з журналістамі. – А каб выбар быў усвядомлены і адказны, трэба разумець, хто такі Прэзідэнт, якая яго роля і як многа залежыць ад выбаршчыкаў. Што датычыцца працэдуры галасавання, то яна простая і не патрабуе асаблівых навыкаў. Моладзі трэба нагадаць пра тое, каб яна не паўтарыла памылак 2020 года, каб не гналася за лжывымі палітычнымі каштоўнасцямі і ідэаламі.

Размова Лідзіі Ярмошынай з моладдзю працягвалася паўтары гадзіны. Спікер нагадала важную ісціну: нельга чагосьці патрабаваць ад краіны, калі сам нічога для яе не зрабіў. Выбары – якраз той самы шанц падтрымаць радзіму.

– Мы можам доўга разважаць пра тое, што такое патрыятызм, – адзначыла спікер. – Але сэнс адзін – гэта калектыўная адказнасць за краіну. Галоўнае права чалавека – права на бяспечнае жыццё. Давайце берагчы тое, што ёсць.

Сярод тых, хто галасаваў упершыню, – студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта харчовых і хімічных тэхналогій (БДУТ) Андрэй Шэндрыкаў. Ён лічыць, што ўдзел у выбарах – гэта вельмі важна і адказна.

– Прыйсці і прагаласаваць – мой грамадзянскі доўг, – паведаміў Андрэй. – Хочацца, каб наша краіна была моцнай і незалежнай.

